З нагоды

# АДУКАЦЫЯ — ГЭТА БУДУЧЫНЯ НАШАЙ КРАІНЫ

## Новы будынак гімназіі № 42 імя Ж. І. Алфёрава адкрыты ў Мінску

**Удзел ва ўрачыстасці прынялі Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ і памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Юрый ФРАЛОЎ.**



З пачатку навучальнага года прыгожы будынак, разлічаны на 1020 навучэнцаў, расчыніў дзверы па новым адрасе — вуліцы Ільянскай. У гімназіі ёсць усё неабходнае для вучобы і для пазакласных заняткаў, а таксама для паўнавартаснага развіцця творчых здольнасцяў дзяцей. Паклапаціліся і пра фізічнае развіццё школьнікаў: плавальны басейн, спартыўныя залы з сучасным абсталяваннем, цір ужо чакаюць наведвальнікаў. Уражваюць актавая зала, камп'ютарны кабінет, кабінеты педагога-псіхолага, сацыяльнага педагога, педагога-арганізатара і кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні. Медыцынскі блок і харчаблок таксама абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Тэрыторыя гімназіі поўнасцю добраўпарадкавана і насычана гульнявымі спартыўнымі пляцоўкамі для заняткаў рознымі відамі спорту.



З прывітальным словам да ўдзельнікаў урачыстай лінейкі звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

— Я шчыра рада павіншаваць вас усіх з цудоўным святам — Днём ведаў. Гэта свята традыцыйна адзначаецца ў нашай краіне, і мы ўсе рыхтуемся да гэтага цудоўнага дня — бацькі, педагогі, будаўнікі. А вас віншую яшчэ з адным святам: гімназія № 2 імя Жарэса Алфёрава набыла новы будынак — прыгожы, утульны, камфартабельны — для вучобы нашых дзяцей і работы педагогаў. Сёння вы адкрываеце новую старонку ў гісторыі вашай гімназіі. Гэты год для нас асаблівы — 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзе ўстанаўлення інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне. Сістэма адукацыі — прыярытэтны кірунак у сацыяльнай палітыцы нашай дзяржавы, таму што мы разумеем, што гэта — будучыня нашай краіны, — сказала Наталля Качанава. — Хачу павіншаваць нашых першакласнікаў. Наколькі для іх гэта хвалюючы дзень! Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі, вучыцеся добра, а самае галоўнае — сябруйце, любіце сваіх настаўнікаў і не засмучайце бацькоў. Мы шчыра жадаем, каб гэтая гімназія стала для вас добрым домам. Шчыра віншую старшакласнікаў — тых, хто ўжо ў гэтым годзе будзе выбіраць свой прафесійны шлях. Я шчыра віншую педагогаў, настаўнікаў, выхавальнікаў — усіх тых, хто будзе працаваць і працуе ў такой няпростай сферы — сістэме адукацыі, але такой патрэбнай нашай краіне.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, да Дня ведаў рыхтуюцца не толькі педагогі, бацькі і школьнікі, але і дзяржаўныя і мясцовыя органы ўлады.

— Прыводзяцца ў парадак дзіцячыя дашкольныя ўстановы, школы, адкрываюцца новыя. Новы будынак для гімназіі — падарунак для такога маладога мікрараёна сталіцы. Гэта гімназія не новая, у яе ўжо ёсць свая слаўная гісторыя, але памяшканне было параўнальна невялікім, а сёння яны пераехалі ў новы будынак, у якім ёсць усе ўмовы для навучання і выхавання, — адзначыла спікер і падкрэсліла, што дзеці — гэта наша будучыня.

— Ад таго, якія яны атрымліваюць веды, як выхоўваюцца ў сценах гімназій і школ, залежыць будучыня нашай краіны. Аб гэтым неаднаразова гаварыў наш Прэзідэнт, у тым ліку ў час Рэспубліканскага педагагічнага савета ў гэтым годзе. Адукацыя — адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Таму ў Беларусі робіцца ўсё для таго, каб дзеці маглі вучыцца, атрымліваць веды, а ў далейшым — рэалізаваць свае здольнасці на карысць Радзімы. Не ў кожнай краіне святкуюць 1 верасня, калі дзеці першы раз прыходзяць у школу, садзяцца за парты, каб атрымліваць веды, — дадала Старшыня Савета Рэспублікі.

У сваю чаргу Уладзімір Кухараў зазначыў, што ў гімназіі створаны ўсе ўмовы для таго, каб атрымліваць якасную адукацыю. Каб кожны атрымаў па сваіх жаданнях і здольнасцях усё неабходнае, што датычыцца навучальных прадметаў, выхаваўчай работы, спартыўных захапленняў і гэтак далей. Ён таксама выказаў спадзяванне, што гімназія стане навуковым і спартыўным цэнтрам для ўсяго мікрараёна, а таксама падорыць нашай краіне вельмі шмат выдатных вучоных.

Як адзначыла дырэктар гімназіі Вікторыя Коржык, прыярытэтны кірунак работы ўстановы адукацыі — стварэнне шматфункцыянальнага адукацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае атрыманне якаснай агульнай сярэдняй адукацыі кожным навучэнцам з улікам яго індывідуальных асаблівасцяў і патрэб. Яна падкрэсліла, што гімназія цудоўна аснашчана, тут выдатны педагагічны калектыў, у тым ліку і маладыя спецыялісты, а бацькі заўсёды гатовы да супрацоўніцтва. Усё гэта будзе спрыяць далейшаму напаўненню адукацыйнай прасторы і развіццю ўстановы адукацыі.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**
**Фота БелТА.**

# Сплаў маладосці і вопыту

**У віцебскім мікрараёне «Білева» ў Дзень ведаў расчыніла свае дзверы ўнікальная ўстанова адукацыі — пачатковая школа № 48. Аналагаў ёй пакуль няма ў нашай краіне. Са святам навучэнцаў, іх бацькоў і педагогаў першымі павіншавалі ганаровыя госці.**



З добрымі словамі і каштоўнымі падарункамі на лінейку да маленькіх віцябчан завіталі **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар СЕРГЯЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН,** прадстаўнікі абласной і гарадской улады.

Шматфункцыянальны аб'ект разлічаны на адначасовае навучанне 850 дзяцей, 560 з іх — гэта выхаванцы дзіцячага сада, 290 — навучэнцы пачатковай школы. Установа падзелена на тры блокі, якія злучаны паміж сабой. У кожнага — свая колеравая гама. Акрамя 31 групы для дзяцей ва ўзросце ад аднаго да шасці гадоў, асобна абсталявана памяшканне для групы кароткачасовага знаходжання.

Для навучэнцаў пачатковай школы абсталявалі 16 класаў з апошняй сучаснай тэхнікай. Ва ўстанове маюцца тры спартыўныя залы, у адной ёсць нават інтэрактыўныя скаладром, басейн, дзве трэнажорныя залы, два музычныя класы, актавая зала на 100 месцаў, клас харэаграфіі і інш. У пакоі псіхалагічнай разгрузкі дзецям прапаноўваюць адпачыць за інтэрактыўным сталом і пагуляць на такой жа падлозе, запрашаюць у майстэрню анімацыі. У школе ёсць робататэхнічны набор рэльефных прадметаў для магнітнай дошкі па развіцці матэматычных здольнасцяў. Расклад заняткаў публікуецца на сэнсарнай панэлі. Важна, што ў 48-й школе падчас будаўніцтва вялікую ўвагу надалі стварэнню безбар'ернага асяроддзя для дзяцей з асаблівасцямі здароўя: тут ёсць пандусы, ліфты для школьнікаў-інвалідаў, шрыфт Брайля.

Па задумцы такая ўнікальная ўстанова павінна дапамагчы дашкольнікам не толькі адаптавацца ў соцыуме, але і плаўна перайсці ад садка да пачатковай школы ў знаёмай цёплай атмасферы. А ў гэтым маладому пакаленню, безумоўна, дапамогуць вопытныя педагогі, здольныя павесці за сабой у краіну ведаў. Дарэчы, педагагічны калектыў новай установы налічвае больш за 100 чалавек, 40 з іх — маладыя спецыялісты.

«У Віцебску запускаецца ўнікальны эксперыментальны праект. Тут гарманічна спалучаецца дашкольная і пачатковая школьная адукацыя. Упэўнены, што гэты праект стане цэнтрам сучасных ведаў, патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання юных жыхароў Віцебска. Асновай, душой школы, вядома, з'яўляецца педагагічны калектыў. Таму мой наказ дырэктару школы — сфарміраваць працаздольны калектыў, у якім спалучаецца вопыт старэйшых педагогаў і запал маладых пачынаючых выпускнікоў віцебскіх і іншых беларускіх ВНУ. Бацькоў заклікаю вучыцца разам з дзецьмі, працаваць разам з педагогамі. Толькі разам мы зможам навучыць дзяцей таму, што неабходна ў жыцці, выхаваць сапраўдных патрыётаў нашай краіны. Звяртаючыся да юных, самых галоўных удзельнікаў сённяшняга мерапрыемства, хацеў бы адзначыць: смела асвойвайце гэты будынак, але беражыце гэтыя сцены і ўсё, што створана працай вашых бацькоў», — звярнуўся да ўдзельнікаў свята старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. Ад імя дэпутатаў ён уручыў дырэктару школы інтэрактыўную панэль.

Сертыфікат на суму 15 тысяч рублёў для папаўнення матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстанове адукацыі ўручыў і кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой. Ён адзначыў, што ў канцэпцыю школы было закладзена шмат сэнсаў. Галоўны — адаптацыйны пераход дзетак з садка ў школу. «Важны момант — гэта эканомія рэсурсаў. Забяспечыць самую высокую якасць, самыя сучасныя тэхналогіі, якія сёння толькі ёсць у нашай краіне, але пры гэтым сэканоміць на стадыі праектавання і будаўніцтва, на стадыі ўтрымання будынка. Гэтая эканомія на адміністрацыі, на нейкіх гаспадарчых функцыях. І трэці важны момант — педагогі. Важна паглядзець на замацаванне, у Віцебскай вобласці яно адно з самых высокіх. Прыкладна 70 % педагогаў, якія пачынаюць працаваць у школах, застаюцца ў гэтых установах адукацыі. Таму цікава будзе паглядзець, наколькі маладыя спецыялісты ўвальюцца ў калектыў», — падзяліўся Дзмітрый Крутой.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін падзякаваў усім, хто прымаў удзел у будаўніцтве пачатковай школы: з этапу праектавання да добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. «Вам, дзеці, жадаю цярпення, з вялікай цікавасцю асвойваць усё тое новае, што вас чакае ў гэтых сценах. Педагогам — удзячных вучняў і таксама берагчы тое, што мы разам стваралі», — пажадаў Аляксандр Субоцін і ўручыў дырэктару школы сертыфікат і спартыўны інвентар.

Сімвалічны ключ ад новага карабля ведаў Віцебшчыны кіраўніку ўстановы адукацыі Ілоне Марчанка ўручыў генеральны дырэктар ААТ «Жылбуд» Аляксандр Літвінаў. Пасля ўрачыстага перарэзвання чырвонай стужкі першымі ў новыя класы зайшлі першакласнікі са сваімі першымі настаўнікамі. Ігар Сергяенка, Дзмітрый Крутой і Аляксандр Субоцін асабіста павіншавалі 1 «А» з новым навучальным годам і ўручылі дзецям кнігі «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку», а таксама азнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай школы.



**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**